# АТЭСТАЦЫЯ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ

**Атэстацыя педагагічных работнікаў** – гэта вывучэнне і ацэнка іх прафесійнага ўзроўню, дзелавых і асабістых якасцей, вынікаў педагагічнай дзейнасці па фарміраванню ведаў, уменняў, навыкаў, інтэлектуальнага, маральнага, творчага і фізічнага развіцця навучэнцаў пры рэалізацыі зместу адукацыйных праграм дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, спецыяльнай, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграм выхавання, ажыццяўленні навукова-метадычнага забеспячэння.

Асноўнымі прынцыпамі атэстацыі педагагічных работнікаў з’яўляюцца калегіяльнасць, сістэмнасць, цэласнасць экспертных ацэнак.

**Атэстацыя педагагічных работнікаў** праводзіцца на прысваенне або пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі.

Атэстацыя праводзіцца на прысваенне другой, першай, вышэйшай кваліфікацыйных катэгорый,  на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст".

- Атэстацыя праводзіцца **па ініцыятыве педагагічнага работніка або па ініцыятыве кіраўніка арганізацыі** сістэмы адукацыі.
- Па **ініцыятыве педагагічнага работніка** праводзіцца атэстацыя **на прысваенне** кваліфікацыйнай катэгорыі.
- **Па ініцыятыве кіраўніка арганізацыі** сістэмы адукацыі (са згоды педагагічнага савета ўстановы адукацыі (савета ўстановы адукацыі),  можа праводзіцца атэстацыя **на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі** ў дачыненні да педагагічнага работніка, які знізіў узровень сваёй працы і дзейнасць якога не адпавядае ўстаноўленым патрабаванням, або педагагічнага работніка, які мае перапынак у працы на педагагічных пасадах больш як два гады. Такой атэстацыі не падлягаюць цяжарныя жанчыны і жанчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да пяці гадоў, члены атэстацыйных камісій. Атэстацыя на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі з'яўляецца для педагагічнага работніка абавязковай.
- Атэстацыя на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі не павінна праводзіцца больш за адзін раз у пяць гадоў.

Педагагічны работнік, які выказаў жаданне прайсці атэстацыю на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі, падае пісьмовую заяву ў атэстацыйную камісію, якая прымае рашэнне аб допуску яго да атэстацыі (адмове ў допуску).

**Абавязковымі ўмовамі допуску педагагічнага работніка** да атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі з’яўляюцца:

- адпаведнасць атрыманай адукацыі кваліфікацыйным патрабаванням;
- наяўнасць стажу работы (акрамя выпадкаў, якія прадугледжаны пунктам 20 Інструкцыі) у адпаведнасці з часткамі першай – чацвёртай пункта 19 Інструкцыі;
- засваенне зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў у тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам.

**Лакальныя дакументы па атэстацыі педагагічных работнікаў**

- Загад аб складзе атэстацыйнай камісіі.
- Загад аб правядзенні атэстацыі педагагічных работнікаў.
- Графік (дапаўненне да графіку) атэстацыі педагагічных работнікаў.

**У дапамогу педагагічным работніка распрацаваны:**

- Форма заявы на атэстацыю.
- Прыкладная праграма вывучэння педагагічнай дзейнасці атэстуемага.
- Інфармацыйныя матэрыялы па падрыхтоўцы да кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай катэгорыі.
- Патрабаванні да прадастаўлення вопыту педагагічнай дзейнасці і кваліфікацыйнага экзамену.

**Усе матэрыялы знаходзяцца ў метадычным кабінеце.**

**Нарматыўнае прававое забеспячэнне атэстацыі педагагічных работнікаў**

http://groiro.by/25-normativnoe-pravovoe-obespechenie-attestacii-pedagogicheskih-rabotnikov.html

**Кваліфікацыйны экзамен**

http://groiro.by/208-kvalifikacionnyy-ekzamen.html